II клас

# Цырк

Ніна вельмі хацела стаць дрэсіроўшчыцай. Яна прапанавала брату Сашу пабыць львом. Саша згадзіўся. Стол і крэслы адцягнулі да сцяны. З дывана́ зрабілі арэну. Саша стараўся быць падобным да льва. Ён бегаў па арэне, куляўся, скакаў праз абруч з чырвонымі стужкамі.

Увечары адбыўся паказ для гледачоў: мамы, таты, бабулі і дзядулі. На арэну ў прыгожай сукенцы выйшла Ніна. Пакланілася, узмахнула рукой — і з клеткі выскачыў Саша-леў. Грозна рыкнуўшы, ён прабег ля самых ног гледачоў. Ніна толькі паспявала даваць каманды, а леў паказваў свой спрыт. Гледачы дружна пляскалі ў далоні.

*Паводле С. Тарасава*

II клас

# Паўлінчын гарох

Вакол хаты Паўлінкі — вялікі агарод. Ён нагадвае казачны куток. Тут дружна і весела растуць бульба, памідоры, капуста, агуркі, цыбуля, часнок, гарох, фасоля, буракі. Морква, перац, шчаўе, гарбузы, а яшчэ — клубніцы, суніцы... А які вялікі сад — яблыні, грушы, вішні, слівы, чарэшні... Во колькі ўсяго!

Для Паўлінкі самай любімай з'яўляецца гарохавая градка. Чаму менавіта гарохавая? Таму што гарох яна садзіла сама. А мама дапамагала ёй: ускапала і разраўняла граблямі градку ды зрабіла баразёнкі для зярнятак.

Толькі Паўлінка закончыла працу, як пайшоў дождж. Густы і цёплы.

— Цяпер твой гарох, дачушка, узыдзе хутка, — сказала мама.

*І. Муравейка*

III клас

## Ягады

Ніна і Зіна — неразлучныя сяброўкі: куды адна, туды і другая. Яны аднагодкі. І ростам дзяўчынкі амаль аднолькавыя. Толькі вось характары ў іх розныя. Мяркуйце самі.

Неяк улетку сяброўкі дамовіліся схадзіць у суніцы. Узялі вядзерцы і падаліся на знаёмую палянку.

Ніна хутка назбірала поўнае вядзерца ягад і кажа:

— Пара ўжо дадому ісці.

А Зіна адказвае:

— Як жа мне ісці дадому, калі ў мяне яшчэ і паўвядзерца няма?

— Давай я табе дапамагу, — прапанавала Ніна і пачала збіраць суніцы ў Зініна вядзерца.

Неўзабаве вядзерца Зіны таксама было поўнае спелых сакавітых ягад. Дзяўчынкі пайшлі дадому.

Па дарозе Зіна адставала і ўсё скардзілася, што яна вельмі стамілася і што вядзерца дужа балюча рэжа ёй руку́.

— Давай я паднясу і тваё, — сказала Ніна і ўзяла ў абедзве рукі па вядзерцу.

Недалёка ад вёскі Ніна спатыкнулася аб тоўсты корань і рассыпала ўсе ягады са свайго вядзерца.

— Дапамажы сабраць, — папрасіла яна сяброўку.

— Сама рассыпала, сама і збірай, — бойка сказала Зіна.

Яна схапіла сваё вядзерца, поўнае спелых суніц, і хуценька пабегла дадому.

*Паводле Н. Парукава*

III клас

## Хто самы моцны?

— Я самы моцны на свеце! — сказаў Стасік дзеду.

Дзед недаверліва зірнуў на ўнука. А Стасік, каб паказаць, які ён моцны, падняў вялікі камень і перанёс яго ад хаты да плота.

— Канечне, ты дужы хлопчык, — сказаў дзед, але ўсё ж не самы моцны на свеце.

Стасік стаяў на сваім:

— Не, я самы моцны. Што яшчэ табе падняць? — спытаў ён у дзеда.

Дзядуля ўсміхнуўся:

— Паднімі асфальт.

— Асфальт? Як жа я падніму яго, калі ён у зямлю ўрос? Гэтага ніхто не зробіць.

І дзед падвёў Стасіка да пухлінкі-разрыву на асфальце. Прыгледзеўся Стасік, а гэта зялёны парастак прабіў асфальт і цягнецца ўгору, да сонца.

— Бачыш, — сказаў дзед, — кволы парастак зрабіў тое, што не змог ты, дужы хлопчык.

Стасік, схіліўшыся, доўга дзівіўся на парастак. І ўжо не настойваў, што ён самы моцны на свеце.

*Паводле Я. Радкевіча*

IV клас

## Чарніцы

Гэтыя цёмна-сінія з шызым налётам ягады ведае кожны. Яны растуць на нізкіх кусціках з рэдкім дробным лісцем. А галінкі якія шчодрыя — аж вочы разбягаюцца.

Зусім няцяжка прыкмеціць: з усіх ягаднікаў — чарнічнік найбольш раскашуе ў лесе, на многія кіламетры раскінуліся яго ўладанні. І ў сасновым бары, і ў ельніку, і нават у гаі пад ліставы́мі дрэвамі. Быццам хтосьці ці штосьці чарніцам спрыяе.

А ўся адгадка, мабыць, у старадаўняй легендзе.

Калісьці, вельмі даўно, людзі даведаліся, што ў Лесавіка ёсць дзівосныя скарбы, і згаварыліся імі завалодаць. Усе лясы і пушчы перакапалі, шукаючы незлічоныя багацці, шмат векавых дрэў паваліlі. Не стала куды прытуліцца беднаму Лесавіку. Пашкадаваў небараку кусцік чарнічніку. Ён не збаяўся, што таксама можа пацярпець, схаваў ляснога ўладара і яго скарбы пад сваімі галінкамі. Людзі не звярнулі ўвагі на маленькі кусцік побач з магутнымі ялінамі і соснамі.

З таго часу ў знак вялікай удзячнасці Лесавік і па сённяшні дзень апякуецца над чарніцамі. Ён самаручна рассяляе чарнічнік па лясных абшарах.

Што ж, чарніцы вартыя такой пашаны. Лесавіковы ягады цудоўныя на смак і карысныя для здароўя.

*Паводле У. Ягоўдзіка*

IV клас

## Хлопчык і крынічка

Адзін хлопчык натрапіў за вёскай на празрыстую крынічку і пакаштаваў з яе вады. З тае пары, дзе б ён ні быў, што б ні рабіў, заўсёды бег да крынічкі. З ёй, струменістай і гаманлівай, хлопчык ніколі не сумаваў. Нагуляўшыся і напіўшыся з крынічкі, ён любіў ляжаць на беражку і кі́даць у ваду каменьчыкі. Крынічка ўскрыквала ад болю:

— Што ты робіш? Ты ж загубіш мяне!

Але хлопчык быццам не чуў яе голасу.

Прайшло шмат часу. І столькі накідаў хлопчык каменьчыкаў у крынічку, што тая не змагла больш трываць крыўду і прапала ў зямлі.

Раззлаваўся хлопчык, што крынічка знікла, стаў таптаць нагамі тое месца, дзе некалі быў струменьчык. А потым пайшоў каштаваць ваду з іншых крынічак. Але нідзе не мог напіцца. Яго душа ўвесь час гарэла ад смагі. Зразумеў тады хлопчык, што дарэмна пакрыўдзіў сваю крынічку. Пабег за вёску і пачаў збіраць і адкідваць убок каменьчыкі. Ён прасіў:

— Даруй мне, крынічка! Цяпер я ніколі не пакрыўджу цябе.

І крынічка пачула яго. Спачатку з зямлі прабіўся тоненькі струменьчык, а потым яна забруіла, заіскрылася, весела заспявала, быццам і не маўчала, заціснутая каменьчыкамі.

— Жывая мая крынічка! — узрадаваўся хлопчык. — Не загінула, даравала мне!

Упаў хлопчык на калені і заплакаў ад радасці. А крынічка змыла з яго твару слёзы і зноў напаіла яго жывой вадой.

*Р. Дамброўская*

II клас

# Лісічкі

Маленькія жоўтыя лісічкі сапраўды як дружныя сястрычкі. Паасобку яны не растуць, а нібыта водзяць вясёлы карагод. Убачыў адну — другая просіцца ў рукі.

Лісічкі — вельмі смачныя грыбы. Праўда, акрамя сапраўдных, у лесе сустракаюцца і падманныя лісічкі. Як іх адрозніць ад сапраўдных? А вельмі проста. Лісічкі, што мы спажываем, нагадваюць колерам сонечных зайчыкаў, а іх падманныя суседзі звычайна аранжавыя ці нават чырвоныя.

Калі засумняваўся, дружа, спытай лепш у мамы або таты. Яны падкажуць, памогуць адрозніць. Ніколі не забывайся, што ёсць атрутныя грыбы, якія шкодзяць здароўю і могуць прынесці вялікую бяду, калі іх з’есці.

*Паводле У. Ягоўдзіка*

II клас

# Пралеска і Клёнік

Аднойчы восенню вецер падхапіў кляновае зярнятка. «Куды я лячу, што са мною будзе?» — ледзь не плакала зярнятка. Але вось упала яно на зямлю. Зярнятка стамілася ад далёкай дарогі і заснула на ўсю зіму.

Вясной прачнулася зярнятка і пачало працаваць: карэньчык выпускаць, зялёным парасткам прабівацца да сонца. Пачаў парастак лісткамі прыбірацца. Азірнуўся вакол, убачыў маленькую кветачку. Раптам кветачка загаварыла:

— Добрай раніцы! Мяне завуць Пралеска. А хто вы?

— А я Клёнік, — адказаў парастак. — Бачыце высокія дрэвы на ўскрайку лесу? Такім буду і я.

— Вельмі прыемна... Я рада з вамі пазнаёміцца.

І Пралеска ветліва ўсміхнулася.

*Паводле Л. Арабей*

III клас

# Добрыя суседзі

Аднойчы захварэлі ў Сінічкі птушаняткі. Нічога ў рот не бяруць, ледзь ціўкаюць паціху. Забедавала сінічка, да Дзятла паляцела, да ляснога лекара. Ён агледзеў хворых птушанят і сказаў разгублена, што дапамагчы не можа, бо лекаў не мае. Хворым патрэбен мядовы настой. У мёдзе ўсе лекі сабраны. Мёду хутчэй дастаць трэба!

Паляцела Сінічка збіраць мёд. Сядзе на кветачку, а тая да самай зямлі хіліцца ці зусім ломіцца. Ні з чым вярнулася дадому. Яшчэ больш зажурылася. Сядзіць каля гнязда і слёзы лье.

— Чаго плачаш, суседка? — пачуўся ціхі галасок.

Сінічка выцерла вочы, а побач Пчала сядзіць.

— Я тваю бяду мігам развяду. Посуд рыхтуй! — сказала Пчала і паляцела збіраць з кветачак мядовы нектар.

Сінічка заспяшалася да хаткі Вавёрачкі, бо бачыла там арэхавыя лушпінкі. Дала ёй Вавёрачка самую вялікую і глыбокую лушпіну.

Паляцела Сінічка да свайго гнязда, а там ужо Пчолка сядзіць, яе чакае. Аддала Пчолка нектар і зноў паляцела збіраць салодкі сок з розных кветачак. Сваім сястрычкам расказала пра Сінiччына гора. І пчолы дружна напоўнілі арэхавую бочачку гаючымі лекамі.

Сінічка стала паіць птушанят мядовым нектарам. Акрыялі птушаняткі, заціўкалі радасна, зноў здаровымі сталі.

Так і жывуць заўсёды добрыя суседзі — адзін аднаму ў бядзе і горы дапамагаюць.

*Паводле В. Гурскага*

III клас

# Сыраежкі

Сыраежкі, як вясёлыя дзяўчаткі, не хаваюцца, а быццам танцуюць па лесе. Першыя гэтыя танцоркі з'яўляюцца ў канцы вясны ці на пачатку лета, пра што сведчыць і грыбны каляндар: зацвілі суніцы — ідзі па сыраежкі.

Апошнія сяброўкі-сыраежкі ўсміхаюцца грыбнікам у кастрычніку, калі зямлю беляць шэранню замаразкі. І ранняя, і позняя сыраежкі — з адной вялікай сям'і. Разам з тым яны не падобныя адна на адну. Вось ужо модніцы дык модніцы! У кожнай свая адметная сукеначка, а капялюшыкі пафарбаваны ў самыя розныя колеры і адценні. Ажно дзіву даешся: як толькі фарбаў усім хапае?

Белыя сыраежкі карагодзяць усюды ў лесе, асабліва каля прыгажунь бяроз і асілкаў дубоў.

Жоўтыя сыраежкі часцей за ўсё збіраюцца ў нізкіх лагчынках.

Зялёныя сыраежкі — звычайныя жыхаркі ліставы́х пералескаў.

Аранжавыя ці чырвоныя сыраежкі, якіх найбольш у лесе, сяброўкі ялін і соснаў.

А яшчэ ёсць рознакаляровыя сыраежкі, якім на капялюшык быццам упала кропелька вясёлкі. Ну як абмінуць такі цуд, як яму не пакланіцца? Скачыце ў кошык! Там весялей вам будзе!

*Паводле У. Ягоўдзіка*

IV клас

# Лясная яблыня

Мы з братам, блукаючы па грыбных мясцінах, натрапілі на дзікую яблыню. Лісце на ёй пачало ўжо жоўкнуць і ападаць, а невялічкія зялёныя яблычкі, якіх не пералічыў бы за дзень, моцна трымаліся за галінкі. Я адарваў адно, паспытаў — яно было цвёрдае і кіслае.

— Затое якія смачныя яны зімой, — сказаў брат, — паляжалыя і прамерзлыя.

— Дык давай выкапаем гэту яблыньку і перавязём у наш сад, — прапанаваў я.

— Можна і перавезці, — падтрымаў мяне брат.

На галіну села нейкая ружова-шэрая птушка і распачала знаёмства з яблынькай — паспытала на смак яблычкі. Некалькі кавалачкаў упалі на зямлю. Прыляцела яшчэ некалькі птушак, потым яшчэ некалькі.

— Птушкі, мабыць, здагадаліся, што мы хочам выкапаць яблыню, і зляцеліся, каб апошні раз паласавацца сакавітымі пладамі, — сумна сказаў брат.

— Валодзя, — звярнуўся я да брата, — давай не будзем перавозіць яблыню з лесу ў вёску.

— Я так сама падумаў, — адказаў брат. — Яблыня лясным жыхарам патрэбна больш, чым нам.

На яблыню зноў пачалі злятацца птушкі.

*Паводле І. Муравейкі*

IV клас

## Вялікая тайна

У Міхася быў свой асабісты фарфоравы кубачак. Толькі з яго хлопчык піў малако, кампот, кісель, чай... На кубку было намалявана шмат рознакаляровых кветак, і таму ён выглядаў як жывы букет. А з донца, як жывая, глядзела смешная кацiная пысачка. Хлопчык сам мыў свой кубачак — хацеў, каб кацiная пысачка заўсёды блішчэла чысцінёй.

Але аднойчы Міхасю захацелася папіць са свайго кубка вады. Калі ён лез на табурэт, кубак выслізнуў і разбіўся. Добра, што нікога ў хаце не было і ніхто не мог яго паўшчуваць: мама з татам пайшлі на работу, а бабуля на градзе працавала. Міхась паглядзеў на чарапкі і ледзь не заплакаў. Ён загарнуў чарапкі ў анучку і схаваў пад шафу: «Гэта будзе мая тайна». А ў наступную раніцу сказаў:

— Мама, мне расхацелася піць са свайго кубка. Налі мне малака ў гэты.

Міхась падаў другі кубак. Мама не пярэчыла, ні пра што не распытвала, толькі папярэдзіла:

— А ты ўсё вып'еш? Гэты кубак большы.

— Вып'ю. Я не маленькі, — адказаў Міхась.

Прайшло тры дні. За снеданнем Міхась уздыхнуў:

— Сёння нічога піць не буду. У мяне жывот ад гэтага кубка, як футбольны мяч, надзімаецца.

— Дык я налью ў меншы.

І мама дастала з буфета кубак, упрыгожаны рознакаляровымі кветкамі і смешнай кацінай пысачкай на донцы. Міхась ад здзіўлення разявіў рот: «Дзіва, дый толькі — кубак ажыў. Сам склеіўся». Каб пераканацца, ён, калі ў хаце нікога не было, прасунуў руку пад шафу і... выцягнуў анучку з чарапкамі. І ўсё зразумеў: мама купіла новы кубак.

— Мама, — сказаў Міхась, калі яна вярнулася з працы, — я хачу адкрыць табе адну вялікую тайну.

*Паводле І. Муравейкі*

II клас

# Цырк

Ніна вельмі хацела стаць дрэсіроўшчыцай. Яна прапанавала брату Сашу пабыць львом. Саша згадзіўся. Стол і крэслы адцягнулі да сцяны. З дывана́ зрабілі арэну. Саша стараўся быць падобным да льва. Ён бегаў па арэне, куляўся, скакаў праз абруч з чырвонымі стужкамі.

Увечары адбыўся паказ для гледачоў: мамы, таты, бабулі і дзядулі. На арэну ў прыгожай сукенцы выйшла Ніна. Пакланілася, узмахнула рукой — і з клеткі выскачыў Саша-леў. Грозна рыкнуўшы, ён прабег ля самых ног гледачоў. Ніна толькі паспявала даваць каманды, а леў паказваў свой спрыт. Гледачы дружна пляскалі ў далоні. (89 слоў)

*Паводле С. Тарасава*

**Кім марыла стаць Ніна?**

**Якую гульню яна прапанавала брату?**

**Перад кім выступалі Ніна-дрэсіроўшчыца і Саша-леў?**

II клас

# Паўлінчын гарох

Вакол хаты Паўлінкі — вялікі агарод. Ён нагадвае казачны куток. Тут дружна і весела растуць бульба, памідоры, капуста, агуркі, цыбуля, часнок, гарох, фасоля, буракі. Морква, перац, шчаўе, гарбузы, а яшчэ — клубніцы, суніцы... А які вялікі сад — яблыні, грушы, вішні, слівы, чарэшні... Во колькі ўсяго!

Для Паўлінкі самай любімай з'яўляецца гарохавая градка. Чаму менавіта гарохавая? Таму што гарох яна садзіла сама. А мама дапамагала ёй: ускапала і разраўняла граблямі градку ды зрабіла баразёнкі для зярнятак.

Толькі Паўлінка закончыла працу, як пайшоў дождж. Густы і цёплы.

— Цяпер твой гарох, дачушка, узыдзе хутка, — сказала мама. (93 словы)

*І. Муравейка*

Неабходна паведаміць вучням, што Паўлінка — імя дзяўчынкі.

**Якая гародніна расце на агародзе?**

**Чаму градку з гарохам Паўлінка любіць больш за іншыя?**

**Чаму мама сказала, што гарох хутка ўзыдзе?**

III клас

## Ягады

Ніна і Зіна — неразлучныя сяброўкі: куды адна, туды і другая. Яны аднагодкі. І ростам дзяўчынкі амаль аднолькавыя. Толькі вось характары ў іх розныя. Мяркуйце самі.

Неяк улетку сяброўкі дамовіліся схадзіць у суніцы. Узялі вядзерцы і падаліся на знаёмую палянку.

Ніна хутка назбірала поўнае вядзерца ягад і кажа:

— Пара ўжо дадому ісці.

А Зіна адказвае:

— Як жа мне ісці дадому, калі ў мяне яшчэ і паўвядзерца няма?

— Давай я табе дапамагу, — прапанавала Ніна і пачала збіраць суніцы ў Зініна вядзерца.

Неўзабаве вядзерца Зіны таксама было поўнае спелых сакавітых ягад. Дзяўчынкі пайшлі дадому.

Па дарозе Зіна адставала і ўсё скардзілася, што яна вельмі стамілася і што вядзерца дужа балюча рэжа ёй руку́.

— Давай я паднясу і тваё, — сказала Ніна і ўзяла ў абедзве рукі па вядзерцу.

Недалёка ад вёскі Ніна спатыкнулася аб тоўсты корань і рассыпала ўсе ягады са свайго вядзерца.

— Дапамажы сабраць, — папрасіла яна сяброўку.

— Сама рассыпала, сама і збірай, — бойка сказала Зіна.

Яна схапіла сваё вядзерца, поўнае спелых суніц, і хуценька пабегла дадому. (164 словы)

*Паводле Н. Парукава*

**Чым падобныя былі Ніна і Зіна?**

**Куды пайшлі дзяўчынкі аднойчы ўлетку?**

**Што адказала Зіна на просьбу Ніны дапамагчы ёй сабраць рассыпаныя ягады?**

III клас

## Хто самы моцны?

— Я самы моцны на свеце! — сказаў Стасік дзеду.

Дзед недаверліва зірнуў на ўнука. А Стасік, каб паказаць, які ён моцны, падняў вялікі камень і перанёс яго ад хаты да плота.

— Канечне, ты дужы хлопчык, — сказаў дзед, але ўсё ж не самы моцны на свеце.

Стасік стаяў на сваім:

— Не, я самы моцны. Што яшчэ табе падняць? — спытаў ён у дзеда.

Дзядуля ўсміхнуўся:

— Падымі асфальт.

— Асфальт? Як жа я падніму яго, калі ён у зямлю ўрос? Гэтага ніхто не зробіць.

І дзед падвёў Стасіка да пухлінкі-разрыву на асфальце. Прыгледзеўся Стасік, а гэта зялёны парастак прабіў асфальт і цягнецца ўгору, да сонца.

— Бачыш, — сказаў дзед, — кволы парастак зрабіў тое, што не змог ты, дужы хлопчык.

Стасік, схіліўшыся, доўга дзівіўся на парастак. І ўжо не настойваў, што ён самы моцны на свеце.

(132 словы)

*Паводле Я. Радкевіча*

**Што зрабіў Стасік, каб паказаць, што ён самы моцны?**

**Што паказаў дзядуля ўнуку?**

**Што здолеў зрабіць кволы парастак?**

IV клас

## Чарніцы

Гэтыя цёмна-сінія з шызым налётам ягады ведае кожны. Яны растуць на нізкіх кусціках з рэдкім дробным лісцем. А галінкі якія шчодрыя — аж вочы разбягаюцца.

Зусім няцяжка прыкмеціць: з усіх ягаднікаў — чарнічнік найбольш раскашуе ў лесе, на многія кіламетры раскінуліся яго ўладанні. І ў сасновым бары, і ў ельніку, і нават у гаі пад ліставы́мі дрэвамі. Быццам хтосьці ці штосьці чарніцам спрыяе.

А ўся адгадка, мабыць, у старадаўняй легендзе.

Калісьці, вельмі даўно, людзі даведаліся, што ў Лесавіка ёсць дзівосныя скарбы, і згаварыліся імі завалодаць. Усе лясы і пушчы перакапалі, шукаючы незлічоныя багацці, шмат векавых дрэў павалілі. Не стала куды прытуліцца беднаму Лесавіку. Пашкадаваў небараку кусцік чарнічніку. Ён не збаяўся, што таксама можа пацярпець, схаваў ляснога ўладара і яго скарбы пад сваімі галінкамі. Людзі не звярнулі ўвагі на маленькі кусцік побач з магутнымі ялінамі і соснамі.

З таго часу ў знак вялікай удзячнасці Лесавік і па сённяшні дзень апякуецца над чарніцамі. Ён самаручна рассяляе чарнічнік па лясных абшарах.

Што ж, чарніцы вартыя такой пашаны. Лесавіковы ягады цудоўныя на смак і карысныя для здароўя. (172 словы)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

**Пра якія ягады ідзе гаворка ў тэксце?**

**Што захацелі зрабіць людзі, калі даведаліся пра скарбы Лесавіка?**

**Які кусцік схаваў ляснога ўладара і яго скарбы пад сваімі галінкамі?**

IV клас

## Хлопчык і крынічка

Адзін хлопчык натрапіў за вёскай на празрыстую крынічку і пакаштаваў з яе вады. З тае пары, дзе б ён ні быў, што б ні рабіў, заўсёды бег да крынічкі. З ёй, струменістай і гаманлівай, хлопчык ніколі не сумаваў. Нагуляўшыся і напіўшыся з крынічкі, ён любіў ляжаць на беражку і́ кідаць у ваду каменьчыкі. Крынічка ўскрыквала ад болю:

— Што ты робіш? Ты ж загубіш мяне!

Але хлопчык быццам не чуў яе голасу.

Прайшло шмат часу. І столькі накідаў хлопчык каменьчыкаў у крынічку, што тая не змагла больш трываць крыўду і прапала ў зямлі.

Раззлаваўся хлопчык, што крынічка знікла, стаў таптаць нагамі тое месца, дзе некалі быў струменьчык. А потым пайшоў каштаваць ваду з іншых крынічак. Але нідзе не мог напіцца. Яго душа ўвесь час гарэла ад смагі. Зразумеў тады хлопчык, што дарэмна пакрыўдзіў сваю крынічку. Пабег за вёску і пачаў збіраць і адкідваць убок каменьчыкі. Ён прасіў:

— Даруй мне, крынічка! Цяпер я ніколі не пакрыўджу цябе.

І крынічка пачула яго. Спачатку з зямлі прабіўся тоненькі струменьчык, а потым яна забруіла, заіскрылася, весела заспявала, быццам і не маўчала, заціснутая каменьчыкамі.

— Жывая мая крынічка! — узрадаваўся хлопчык. — Не загінула, даравала мне!

Упаў хлопчык на калені і заплакаў ад радасці. А крынічка змыла з яго твару слёзы і зноў напаіла яго жывой вадой. (180 слоў)

*Р. Дамброўская*

**Чым хлопчык пакрыўдзіў крынічку?**

**Што стала з крынічкай?**

**Што пачаў рабіць хлопчык, калі зразумеў, што дарэмна пакрыўдзіў крынічку?**

II клас

## Лісічкі

Маленькія жоўтыя лісічкі сапраўды як дружныя сястрычкі. Паасобку яны не растуць, а нібыта водзяць вясёлы карагод. Убачыў адну — другая просіцца ў рукі.

Лісічкі — вельмі смачныя грыбы. Праўда, акрамя сапраўдных, у лесе сустракаюцца і падманныя лісічкі. Як іх адрозніць ад сапраўдных? А вельмі проста. Лісічкі, што мы спажываем, нагадваюць колерам сонечных зайчыкаў, а іх падманныя суседзі звычайна аранжавыя ці нават чырвоныя.

Калі засумняваўся, дружа, спытай лепш у мамы або таты. Яны падкажуць, памогуць адрозніць. Ніколі не забывайся, што ёсць атрутныя грыбы, якія шкодзяць здароўю і могуць прынесці вялікую бяду, калі іх з’есці. (92 словы)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

**Пра якія грыбы ідзе размова ў тэксце?**
**Чаму лісічкі называюць дружнымі сястрычкамі?**
**Што нагадваюць колерам сапраўдныя лісічкі?**

II клас

## Пралеска і Клёнік

Аднойчы восенню вецер падхапіў кляновае зярнятка. «Куды я лячу, што са мною будзе?» — ледзь не плакала зярнятка. Але вось упала яно на зямлю. Зярнятка стамілася ад далёкай дарогі і заснула на ўсю зіму́.

Вясной прачнулася зярнятка і пачало працаваць: карэньчык выпускаць, зялёным парасткам прабівацца да сонца. Пачаў парастак лісткамі прыбірацца. Азірнуўся вакол, убачыў маленькую кветачку. Раптам кветачка загаварыла:

— Добрай раніцы! Мяне завуць Пралеска. А хто вы?

— А я Клёнік, — адказаў парастак. — Бачыце высокія дрэвы на ўскрайку лесу? Такім буду і я.

— Вельмі прыемна... Я рада з вамі пазнаёміцца.

І Пралеска ветліва ўсміхнулася. (95 слоў)

*Паводле Л. Арабей*

**Як кляновае зярнятка правяло зіму?**
**Што зрабіла зярнятка, калі прачнулася вясною?**
**З кім пазнаёміўся маленькі Клёнік?**

III клас

## Добрыя суседзі

Аднойчы захварэлі ў Сінічкі птушаняткі. Нічога ў рот не бяруць, ледзь ціўкаюць пацісху. Забедавала сінічка, да Дзятла паляцела, да ляснога лекара. Ён агледзеў хворых птушанят і сказаў разгублена, што дапамагчы не можа, бо лекаў не мае. Хворым патрэбен мядовы настой. У мёдзе ўсе лекі сабраны. Мёду хутчэй дастаць трэба!

Паляцела Сінічка збіраць мёд. Сядзе на кветачку, а тая да самай зямлі хіліцца ці зусім ломіцца. Ні з чым вярнулася дадому. Яшчэ больш зажурылася. Сядзіць каля гнязда і слёзы лье.

— Чаго плачаш, суседка? — пачуўся ціхі галасок.

Сінічка выцерла вочы, а побач Пчала сядзіць.

— Я тваю бяду мігам развяду. Посуд рыхтуй! — сказала Пчала і паляцела збіраць з кветачак мядовы нектар.

Сінічка заспяшалася да хаткі Вавёрачкі, бо бачыла там арэхавыя лушпінкі. Дала ёй Вавёрачка самую вялікую і глыбокую лушпіну.

Паляцела Сінічка да свайго гнязда, а там ужо Пчолка сядзіць, яе чакае. Аддала Пчолка нектар і зноў паляцела збіраць салодкі сок з розных кветачак. Сваім сястрычкам расказала пра Сініччына гора. І пчолы дружна напоўнілі арэхавую бочачку гаючымі лекамі.

Сінічка стала паіць птушанят мядовым нектарам. Акрыялі птушаняткі, заціўкалі радасна, зноў здаровымі сталі.

Так і жывуць заўсёды добрыя суседзі — адзін аднаму ў бядзе і горы дапамагаюць. (192 словы)

*Паводле В. Гурскага*

**Чаму забедавала Сінічка?**
**Хто дапамог Сінічцы збіраць мядовы нектар?**
**Каго з герояў твора можна назваць добрымі суседзямі?**

III клас

## Сыраежкі

Сыраежкі, як вясёлыя дзяўчаткі, не хаваюцца, а быццам танцуюць па лесе. Першыя гэтыя танцоркі з'яўляюцца ў канцы вясны ці на пачатку лета, пра што сведчыць і грыбны каляндар: зацвілі суніцы — ідзі па сыраежкі.

Апошнія сяброўкі-сыраежкі ўсміхаюцца грыбнікам у кастрычніку, калі зямлю беляць шэранню замаразкі. І раннія, і познія сыраежкі — з адной вялікай сям'і. Разам з тым яны не падобныя адна на адну. Вось ужо модніцы дык модніцы! У кожнай свая адметная сукеначка, а капялюшыкі пафарбаваны ў самыя розныя колеры і адценні. Ажно дзіву даешся: як толькі фарбаў усім хапае?

Белыя сыраежкі карагодзяць усюды ў лесе, асабліва каля прыгажунь бяроз і асілкаў дубоў.

Жоўтыя сыраежкі часцей за ўсё збіраюцца ў нізкіх лагчынках.

Зялёныя сыраежкі — звычайныя жыхаркі ліставы́х пералескаў.

Аранжавыя ці чырвоныя сыраежкі, якіх найбольш у лесе, сяброўкі ялін і соснаў.

А яшчэ ёсць featuresнакаляровыя сыраежкі, якім на капялюшык быццам упала кропелька вясёлкі. Ну як абмінуць такі цуд, як яму не пакланіцца? Скачыце ў кошык! Там весялей вам будзе! (158 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

**Як аўтар называе сыраежкі?**
**Калі ў лесе з'яўляюцца сыраежкі?**
**На што падобныя featuresнакаляровыя сыраежкі?**

IV клас

# Лясная яблыня

Мы з братам, блукаючы па грыбных мясцінах, натрапілі на дзікую яблыню. Лісце на ёй пачало ўжо жоўкнуць і ападаць, а невялічкія зялёныя яблычкі, якіх не пералічыў бы за дзень, моцна трымаліся за галінкі. Я адарваў адно, паспытаў — яно было цвёрдае і кіслае.

— Затое якія смачныя яны зімой, — сказаў брат, — паляжалыя і прамерзлыя.

— Дык давай выкапаем гэту яблыньку і перавязём у наш сад, — прапанаваў я.

— Можна і перавезці, — падтрымаў мяне брат.

На галіну села нейкая ружова-шэрая птушка і распачала знаёмства з яблынькай — паспытала на смак яблычкі. Некалькі кавалачкаў упалі на зямлю. Прыляцела яшчэ некалькі птушак, потым яшчэ некалькі.

— Птушкі, мабыць, здагадаліся, што мы хочам выкапаць яблыню, і зляцеліся, каб апошні раз паласавацца сакавітымі пладамі, — сумна сказаў брат.

— Валодзя, — звярнуўся я да брата, — давай не будзем перавозіць яблыню з лесу ў вёску.

— Я так сама падумаў, — адказаў брат. — Яблыня лясным жыхарам патрэбна больш, чым нам.

На яблыню зноў пачалі злятацца птушкі. (151 слова)

*Паводле І. Муравейкі*

**Дзе хлопчыкі ўбачылі дзікую яблыню?**
**Куды хлопчыкі захацелі перанесці яблыню?**
**Чаму яны адмовіліся ад сваёй задумы?**

IV клас

# Вялікая тайна

У Міхася быў свой асабісты фарфоравы кубачак. Толькі з яго хлопчык піў малако, кампот, кісель, чай... На кубку было намалявана шмат рознакаляровых кветак, і таму ён выглядаў як жывы букет. А з донца, як жывая, глядзела смешная кацiная пысачка. Хлопчык сам мыў свой кубачак — хацеў, каб кацiная пысачка заўсёды блішчэла чысцінёй.

Але аднойчы Міхасю захацелася папіць са свайго кубка вады. Калі ён лез на табурэт, кубак выслізнуў і разбіўся. Добра, што нікога ў хаце не было і ніхто не мог яго паўшчуваць: мама з татам пайшлі на работу, а бабуля на градзе працавала. Міхась паглядзеў на чарапкі і ледзь не заплакаў. Ён загарнуў чарапкі ў анучку і схаваў пад шафу: «Гэта будзе мая тайна». А ў наступную раніцу сказаў:

— Мама, мне расхацелася піць са свайго кубка. Налі мне малака ў гэты.

Міхась падаў другі кубак. Мама не пярэчыла, ні пра што не распытвала, толькі папярэдзіла:

— А ты ўсё вып’еш? Гэты кубак большы.

— Вып’ю. Я не маленькі, — адказаў Міхась.

Прайшло тры дні. За снеданнем Міхась уздыхнуў:

— Сёння нічога піць не буду. У мяне жывот ад гэтага кубка, як футбольны мяч, надзімаецца.

— Дык я налью ў меншы.

І мама дастала з буфета кубак, упрыгожаны рознакаляровымі кветкамі і смешнай кацінай пысачкай на донцы. Міхась ад здзіўлення разявіў рот: «Дзіва, дый толькі — кубак ажыў. Сам склеіўся». Каб пераканацца, ён, калі ў хаце нікога не было, прасунуў руку пад шафу і... выцягнуў анучку з чарапкамі. І ўсё зразумеў: мама купіла новы кубак.

— Мама, — сказаў Міхась, калі яна вярнулася з працы, — я хачу адкрыць табе адну вялікую тайну.
(254 словы)

*Паводле І. Муравейкі*

**Якімі малюнкамі быў аздоблены асабісты кубачак Міхася?**

**Якая тайна з’явілася ў хлопчыка?**

**Што зразумеў Міхась, калі мама дастала з буфета новы кубак, упрыгожаны рознакаляровымі кветкамі і смешнай кацінай пысачкай на донцы?**